Адкрыта рэгістрацыя на XIX Міжнародныя кнігазнаўчыя чытанні, паведамляецца на сайце Нацыянальная бібліятэкі Беларусі. Маштабная навуковая канферэнцыя адбудзецца 27—28 красавіка ў галоўнай бібліятэцы краіны. Традыцыйна праблемнае поле канферэнцыі будзе ўключаць пытанні гісторыі кніжнай культуры ад старажытнасці да сучасных тэндэнцый развіцця. Тэматыка канферэнцыі плануецца разнастайнай. На думку арганізатараў, штогадовыя Міжнародныя кнігазнаўчыя чытанні спрыяюць наладжванню навуковага дыялогу і супрацоўніцтва паміж даследчыкамі розных краін, даюць магчымасць падзяліцца вынікамі навуковых дасягненняў, садзейнічаюць выпрацоўцы эфектыўных падыходаў для вырашэння наспелых праблем, натхняюць удзельнікаў на ўвасабленне новых ідэй і праектаў.